
ЛЮДЗІ ЗЯМЛІ
І СОНЦА
4

КАДРЫ МІНУЛАГА
Ў ЛІЧБАВЫМ
ФАРМАЦЕ
5


Выдаецца
з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

2 СНЕЖНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 237 (29859)

### КОРАТКА

• Старшынёй Пастаяннага савета АДКБ абраны паўнамоцны прадстаўнік Беларусі Аляксандр Грыневіч.

• У Мінску адкрыўся кантакт-цэнтр сацыяльных паслуг 139.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Святлана БАРТАШ, член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў:**

*«Падчас падрыхтоўкі праекта Закона «Аб змене законаў па пытаннях падаткаабкладання» была праведзена вялікая работа па аналізе існуючых палажэнняў Падатковага кодэкса. Удасканальваецца падаткаабкладанне індывідуальных прадпрымальнікаў і самазанятых грамадзян. Індывідуальныя прадпрымальнікі з 1 студзеня 2023 года не могуць працаваць па спрошчанай сістэме падаткаабкладання. Пры гэтым на іх выбар захаваны два віды падаткаў — гэта адзіны і падаходны падатак, яны могуць самі вызначыцца. Невялікія змены таксама закрануць грамадзян, якія займаюцца рамесніцтвам і аграэкатурызмам. З 1 ліпеня 2023 года яны мусяць перайсці на выплату прафесійнага падатку. Ён таксама будзе вагацца ад 10 да 20 % і залежаць ад велічыні выручкі. Ячшэ такі момант: камеральныя праверкі будуць ажыццяўляцца, пачынаючы з 1 студзеня 2023 года, у дачыненні да грамадзян, якія доўгі час не працуюць (больш за 5 гадоў). Іх расходы будуць суаднімярацца з іх даходамі».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## «ЗДАБЫВАЦЬ УРОКІ — НАЙВАЖНЕЙШАЯ НАША ЗАДАЧА»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях абароны. Асаблівасці развіцця ваенна-палітычнай абстаноўкі вакол нашай краіны і меры далейшага рэагавання на яе былі абмеркаваны з удзелам усяго сілавога блока.**

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ўсе сілавыя ведамствы адзначаюць рост колькасці правакацый паблізу дзяржаўнай граніцы. «Украіна пад любой падставай спрабуе ўцягнуць войскі дзяржаў — членаў НАТА ў канфлікт, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Усё гэта пацвярджаецца нядаўнімі падзеннямі ракет на тэрыторыю Польшчы. Адначасова з боку збеглай апазіцыі — бандытаў нашых — усё часцей гучаць заклікі да захопу ўлады сілавым шляхам і здзяйснення тэрарыстычных актаў на тэрыторыі Беларусі».

Як адзначыў Прэзідэнт, асобныя з гэтых збеглых — не проста здраднікі, але і экстрэмісты ў квадрацы. «Па-іншаму назваць іх не магу, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Ужо адкрыта, не саромеючыся, заклікаюць да нанясення ўдараў па аб'ектах на тэрыторыі нашай краіны. Забыліся нават аб тым, што на тэрыторыі Беларусі пражываюць іх родзічы».

СТАР. 2



Фота БелТА.

Працоўныя адносіны



## НЕ ВЫСЛУХАЛІ. ЗВОЛЬНІЛІ. АДНАВІЛІ...

**Просьбы растлумачыць той ці іншы аспект працоўнага заканадаўства штодня паступаюць на «гарачую лінію» прававой інспекцыі працы Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў. Такая дапамога можа змяніць жыццё цэлай сям'і, прадухіліць парушэнне закона. Падчас апошняга рэспубліканскага прафсаюзнага прававога прыёму грамадзян, які ахапіў 21 раён Гомельшчыны, менавіта аб працоўным заканадаўстве паступіла 70 пытанняў. Адносіны паміж наймальнікам і работнікам не павінны быць гульнёй без правілаў. Абодва бакі могуць атрымаць пенальці ў свае вароты. Паказальная гісторыя, калі парушэнне заканадаўства прыводзіць да непрыемнай сітуацыі як для работніка, так і для наймальніка, адбылася ў Жлобінскім раёне.**

### ФАКТ: АБ ЗВАЛЬНЕННІ ПАВЕДАМІЛІ ПА ТЭЛЕФОНЕ

У жніўні на адрас Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў паступіў зварот работніцы аднаго з прадпрыемстваў Жлобінскага раёна. Яе, цяжарную жанчыну, наймальнік звольніў, па яе словах, за прагулы без уважлівай прычыны.

— Звольненая звярнулася спачатку ў Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі, а пасля на «гарачую лінію» абласнога аб'яднання па кансультацыйную дапамогу, якая была ёй аказана ў поўным аб'ёме, — расказвае **галоўны прававы інспектар працы Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Таццяна СТАШУК**.

Менавіта Таццяна Аляксандраўна адгукнулася на просьбу аб дапамозе цяжарнай жанчыны.

— Пэўнай рэгламентнай працэдуры дапамогі ў падобных сітуацыях няма. У законе дакладна прапісана, што члену прафсаюза аказваецца поўная бясплатная юрыдычная падтрымка.

СТАР. 4



Сітуацыя

## На змену пандэміі — трыдэмія?

### Урачы нагадалі пра неабходнасць вакцынацыі супраць грыпу і COVID-19

**У свеце з'явіўся новы медыцынскі тэрмін «трыдэмія». Са спалучэннем COVID-19, грыпу і рэспіраторна-сінцытыяльнага віруса ўжо сутыкнуліся ў ЗША. Цэнтры па кантролі і прафілактыцы захворванняў давдзенай краіны паведамляюць пра павышаную актыўнасць рэспіраторных вірусаў. Напрыклад, колькасць шпіталізацый з-за грыпу з'яўляецца самай высокай за апошнія 10 гадоў. Выраслі і выпадкі заражэнняў рэспіраторна-сінцытыяльным вірусам, што нехарактэрна для позняй восені — пачатку зімы. Увогуле, цяпер назіраецца ўсплёск і сумесная цыркуляцыя іншых рэспіраторных вірусаў, акрамя SARS-CoV-2. Пры гэтым спалучэнне нават двух вірусаў, якія адначасова пашкоджваюць дыхальную сістэму, прыводзіць да больш цяжкай і працяглай хваробы.**

Трэба сказаць, што ў апошнія два гады дамінуючым быў SARS-CoV-2. Пры гэтым сезонная цыркуляцыя іншых рэспіраторных вірусаў была істотна ніжэйшай, чым звычайна. Цяпер жа амерыканскія эпідэміёлагі адзначаюць: актыўнасць рэспіраторна-сінцытыяльнага віруса яшчэ ў лістападзе наблізілася да сезоннага піка, які звычайна адзначаецца ў снежні-студзені. Фіксуюць яны раннюю і нарастаючую актыўнасць грыпу. Адначасова чакаецца, што зімой вырасце і колькасць заражэнняў каранавірусам.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X
22237>
9 771990 763008

**Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.**



# «ЗДАБЫВАЦЬ УРОКІ — НАЙВАЖНЕЙШАЯ НАША ЗАДАЧА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На такім фоне, па словах Аляксандра Лукашэнкі, заходнія дзяржавы працягваюць нарошчваць ваенны патэнцыял сваіх узброеных сіл, мадэрнізуюць інфраструктуру на тэрыторыі суседніх краін, павялічваюць інтэнсіўнасць правядзення мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі. «Усё гэта вядзе да абвастрэння і так складанай ваенна-палітычнай абстаноўкі вакол нашай краіны і ў рэгіёне ў цэлым, — падкрэсліў ён. — Пакуль нам удаецца стрымліваць верагоднага праціўніка ад прымянення ваеннай сілы супраць Беларусі. Але, тым не менш, мы павінны пастаянна адсочваць, бачыць і не прапусціць — ні ў якім выпадку не прапусціць! — прыкметы, якія ўказваюць на непасрэдную падрыхтоўку да агрэсіі супраць нашай краіны».

Сёння, як паведаміў Галоўнакамандуючы, неабходна зрабіць зрэз таго, што ўжо выканана для абароны дзяржавы, і намеціць, у якім напрамку трэба рухацца ў далейшым. «Я заўсёды паўтараў і яшчэ раз хачу сказаць: урокі, урокі, урокі — з таго, што адбываецца па перыметры нашай Беларусі, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Здабываць урокі — найважнейшая наша задача».

Падчас нарады з сілавым блокам была ацэнена эфектыўнасць ужо прынятых мер па павышэнні абараназдольнасці дзяржавы, вызначана, ці патрэбна прымаць дадатковыя рашэнні на ўзроўні Прэзідэнта.

**Вераніка КАНЮТА.**

## У тэму

У размове з журналістамі **міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН** адзначыў, што нарада ў кіраўніка дзяржавы — планавае мерапрыемства, але не апошняе. «Нарада падкрэслівае, наколькі вялікую значнасць наш Прэзідэнт надае пытанням ваеннай бяспекі дзяржавы ў межах той абстаноўкі, якая склалася вакол краіны, — звярнуў увагу кіраўнік ваеннага ведамства. — Карыстаючыся сваімі індыкатарамі, бачым, што абстаноўка не становіцца лепшай, ідзе яе нагнятанне. На жаль, бачым, што нашы суседнія дзяржавы актыўнымі крокамі мілітарызуюцца».

Аднак, па словах міністра абароны, палохацца не трэба — непасрэднай падрыхтоўкі няма. «Бачачы, як дзейнічаюць нашы суседзі, мы, натуральна, абавязаныя рэагаваць на ўсё, што адбываецца, і рыхтаваць свае Узброеныя Сілы, сваю дзяржаву перш за ўсё да абароны, — падкрэсліў Віктар Хрэнін. — Мы не збіраемся нікому пагражаць, ні на кога нападаць. Мы хочам на сваёй тэрыторыі самастойна жыць, прымаць рашэнні, захоўваць суверэнітэт, незалежнасць, тэрытарыяльную цэласнасць».

Кіраўнік абароннага ведамства расказаў, што на нарадзе Прэзідэнт заслухаў тыя рашэнні, якія былі прыняты раней. «Мы яшчэ раз пагледзелі, ці не допускаем памылкі, — удакладніў Віктар Хрэнін. — Добра разумеем, што, уцягнуўшыся ў гонку ўзбраенняў, як робяць некаторыя дзяржавы, можам стварыць непрыемнасці нашай эканоміцы і пэўныя сацыяльныя праблемы. Трэба зыходзіць з прынцыпу разумнай дастатковасці, першай неабходнасці — гэта падкрэсліў і кіраўнік дзяржавы. Ніякай празмернасці, чагосьці непатрэбнага. Перш за ўсё ў дадзенай сітуацыі мы павінны разлічваць на свае сілы, гатоўнасць абараняць сваю краіну самастойна».

Міністр абароны адзначыў, што асноўным выгадаатрымальнікам ад усёй гэтай напружанай абстаноўкі і каля нашых граніц, і ўвогуле ў свеце з'яўляюцца ЗША. «Яны спрабуюць аслабіць Расію, паглынаюць Еўрасаюз і ўжо, груба кажучы, паставілі на калені эканоміку Украіны, — заўважыў ён. — Правакацыі, якія могуць быць і на якія мы прадумваем, як адказваць, — хутчэй за ўсё, у іх інтарэсах. Для таго, каб мы туды ўцягнуліся. Мы тое разумеем. На гэтыя правакацыі будзем рэагаваць, але якімі формамі і спосабамі — наша справа».

Адна з ключавых задач, пастаўленая Галоўнакамандуючым перад ваенным ведамствам, па словах міністра абароны, — аналізаваць, рабіць высновы, вучыцца на тым вопыце, які цяпер можна назіраць на поўдні ад нашай краіны. У сувязі з апошнім уносяцца значныя змяненні ў планы, праграмы баявой падрыхтоўкі ваеннаслужачых.

Блізкая ўлада

## ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 3 снежня, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Сцяпанавіч КАРАНІК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васілевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Наша пазіцыя

# СПОРТ СТАЎ НЕ ПРОСТА ЭЛЕМЕНТАМ ПАЛІТЫКІ, А ПАЛІТЫКАЙ

## Якія меры прымаюцца, каб абараніць беларускіх паралімпійцаў

**На нядаўняй пазачарговай Генасамблеі Міжнароднага паралімпійскага камітэта ў Берліне было прынята рашэнне аб прыпыненні членства паралімпійскіх камітэтаў Беларусі і Расіі ў МПК. Зразумела, што пакідаць гэта без адказу нельга. Прадстаўнікі Нацыянальнага паралімпійскага камітэта расказалі, якія меры прымаюцца, каб абараніць атлетаў і ўстанавіць справядлівасць.**



Па словах **старшыні Нацыянальнага паралімпійскага камітэта Алега ШЭПЕЛЯ**, гэтае рашэнне не было нечаканым. Беларускі бок падрыхтаваў матэрыялы, дзе падрабязна і канкрэтна растлумачыў, што не парушыў ні аднаго пункта Канстытуцыі Міжнароднага паралімпійскага камітэта.

Акрамя таго, ёсць пэўныя пытанні і да правядзення Генасамблеі ў Берліне. У склад Міжнароднага паралімпійскага камітэта ўваходзіць 184 краіны. За прыпыненне членства паралімпійскага камітэта Беларусі прагаласавалі 54 дэлегаты, супраць — 45, 18 краін устрымаліся. Але ў Берліне не прысутнічалі прадстаўнікі паралімпійскіх камітэтаў іншых краін, пераважна краін постсавецкай прасторы, якія, хутчэй за ўсё, падтрымалі б беларусаў. Прычына іх адсутнасці ў тым, што ім не далі візы.

«Тое, што ёсць раскол у паралімпійскім руху, — адназначна. Мы даслалі петыцыю ў трыбунал Міжнароднага паралімпійскага камітэта. Разам з юрыстамі дакументальна расклалі, якія пункты Канстытуцыі Міжнароднага паралімпійскага камітэта парушаюцца. Спадзяюся, што будзе разгледжана аб'ектыўна. Хоць зараз спорт стаў не проста элементам палітыкі, а палітыкай. Мы не пакідаем надзеі. Мы можам падаць іск у Канстытуцыйны суд Германіі, паколькі Міжнародны паралімпійскі камітэт дзейнічае ў гэтай краіне. Працоўвалі ўжо пытанне з нямецкімі адвакатамі. Але трэба ўзважыць усе «за» і «супраць», таму што гэта каштуе немалых грошай і, на жаль, у наш час мы не можам разлічваць на аб'ектыўнасць. Крок за крокам, зыходзячы з усіх правіл, мы будзем рухацца наперад. Мы павінны рабіць усё магчымае, каб нашы спартсмены не толькі трэніраваліся, а як мага часцей выступалі і спаборнічалі», — адзначыў Алег Шэпель.

**Генеральны сакратар Нацыянальнага паралімпійскага камітэта Мікалай ШУДЗЕЙКА** падкрэсліў, што міжнародныя чыноўнікі пакідалі без адказу адкрытыя звароты і лісты. Нікто дакладна не растлумачыў, за што беларускіх спартсменаў спачатку адхілілі ад удзелу ў Паралімпійскіх гульнях у Пекіне за дзень да старту, а затым спынілі членства беларускага паралімпійскага камітэта ў міжнародным. Мікалай Шудзейка нагадаў, што ў Пекіне спартыўныя дэлегацыі розных краін паводзілі сябе абсалютна дружалюбна і ніякай эскалацыі ў іх адносінах не адчувалася — толькі палітычная падаплёка рашэння Міжнароднага паралімпійскага камітэта, кіраўнікі якога так і не з'явіліся ў алімпійскай вёсцы. «У першую чаргу пацярпелі спартсмены, былі нанесены вялізны маральны ўрон. Яны пакпалі столькі крыві і поту, каб паказаць дастойны вынік. Іх пазбавілі такой магчымасці. Мы адчулі поўную падтрымку з боку ўрада, прыватных кампаній, сродкаў масавай інфармацыі. Мы не адчувалі, што засталіся самнасам са сваёй праблемай. Мы распрацавалі пэўны план, каб абараніць гонар і годнасць нашых спартсменаў і нашага паралімпійскага камітэта. Мы выконваем усе прынцыпы і палажэнні, прадэкламаваныя ў Канстытуцыі Міжнароднага паралімпійскага камітэта. Галоўны прынцып — спартыўны нейтралітэт. Мы не палітыкі, не вайскоўцы. Мы займаліся сваёй справай і стараліся рабіць гэта добра. Мы за мір, за мірнае суіснаванне. Мы супраць любой дыскрымінацыі. Лічым, што гэта было палітызаванае дыскрымінацыйнае рашэнне Міжнароднага паралімпійскага камітэта — спачатку адхіліць спартсменаў, а затым прыпыніць наша членства», — заявіў Мікалай Шудзейка. Таксама генсек Нацыянальнага паралімпійскага камітэта расказаў, што кожны член нацыянальнай каманды, які не змог выступіць у Пекіне, накіраваў іск у Еўрапейскі суд па справах чалавека. Сёння Паралімпійскі камітэт Беларусі гатовы выкарыстаць усе юрыдычныя спосабы, каб дабіцца справядлівасці і вяртання беларускіх спартсменаў на міжнародную арэну.

**Шматразовая чэмпіёнка Паралімпійскіх гульняў Святлана САХАНЕНКА** прызналася, што зараз спартсменам усё складаней знайсці матывацыю і жаданне трэніравацца. «Спаборніцтвы — самае важнае ў нашай рабоце. Для паралімпійцаў спорт — не толькі праца, а сацыялізацыя і самарэалізацыя, цэлае жыццё. Мы не палітыкі. Наша задача — паказаць вынік, што мы і рабілі. Але ў нас такую магчымасць адабралі, і гэта не паддаецца ніякай логіцы. Пайшло ўсё насуперак алімпійскаму руху. Самае жахлівае — у свеце забылі, што ёсць спорт, забылі, па якіх правілах і законах ён існуе. На сёння наша задача — падладзіцца пад тое, што адбываецца, і выціснуць максімум з усяго, што ў нас ёсць», — падкрэсліла спартсменка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### «ГЭТА НЕСПРАВЯДЛІВА»

Абарону правоў беларускіх паралімпійцаў абмеркавалі і на сустрэчы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі з кіраўніцтвам Паралімпійскага камітэта Беларусі. «Парламентарыі гэтак жа, як і ўсе грамадзяне нашай краіны, вельмі абураныя тым, што Міжнародны паралімпійскі камітэт вынес рашэнне аб прыпыненні членства Рэспублікі Беларусь у Міжнародным паралімпійскім камітэце. Мы выдатна разумеем, што спорт павінен быць па-за палітыкай, як і ахова здароўя. На сёння і спорт зрабілі палітыкай, і паралімпійскі рух», — сказала **Людміла МАКАРЫНА-КІБАК, старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў**.

У ходзе сустрэчы была прынятая сумесная заява пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, па працы і сацыяльных пытаннях, па міжнародных справах, а таксама пастаянных камісій Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. Гэтая заява асуджае палітычна ангажаванае рашэнне Міжнароднага паралімпійскага камітэта.

«Людзі, якія маюць асаблівасці ў развіцці або атрымалі інваліднасць на працягу жыцця, — асаблівыя. Яны сваёй прыхільнасцю да спорту паказваюць сілу волі для ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь. Мы заўсёды вельмі любілі за іх перажываць, назіраць, як яны трэніруюцца. І сёння, калі бачым такую несправядлівасць, прынялі рашэнне сабраць тры камісіі Палаты прадстаўнікоў, запрасілі нашых калег з Савета Рэспублікі і вырашылі прыняць заяву, якую потым давесці да Міжнароднага парламенцкага руху. Мы хочам прыцягнуць увагу грамадскасці не толькі Рэспублікі Беларусь, але і ўсяго свету, таму што гэта несправядліва. Мы не толькі павінны даваць людзям з асаблівасцямі развіцця ўдзельнічаць у спорце, але і сваім жыццёвым прыкладам паказваць, як трэба любіць жыццё, як актыўна ў ім удзельнічаць», — падкрэсліла Людміла Макарына-Кібак.

# ІМЕМ МІКАЛАЯ ЧАРГІНЦА НАЗВАЛІ ШКОЛУ



**Сёлета ў Рэспубліцы Беларусь адзначылі 85-годдзе ганаровага старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая ЧАРГІНЦА. Вядомы пісьменнік, аўтар болей як паўсотні раманаў, за свае творчыя здзяйсненні, грамадска-палітычную працу адзначаны званнем народнага пісьменніка Беларусі. А літаральна днямі ў сталіцы Беларусі прынята рашэнне аб наданні СШ № 76 імя Мікалая Чаргінца.**

Пісьменнік нарадзіўся 17 кастрычніка 1938 года. Займаўся футболам. Служыў у праваахоўных органах. Генерал-лейтэнант. Многія гады аддаў палітычнай дзейнасці, узначальваў адну з камісій у Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прадстаўляў нашу краіну ў розных міжнародных арганізацыях.

У апошнія гады Мікалай Чаргінец выдаў раманы «А ён не вярнуўся з бою», «Маёр Ветраў», «Аперацыя «Кроў». У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыў свет двухтомнік мемуараў вядомага літаратара, дзе ён расказвае пра сябе і час, пра калег па службе ў міліцыі, сваіх паплечнікаў па спартыўнай кар'еры. Адна з кінематаграфічных кампаній працуе над падрыхтоўкай кінафільма паводле рамана М. Чаргінца «Аперацыя «Кроў», прысвечанага драматычным падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

# На змену пандэміі — трыдэмія?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як адзначаў **загадчык кафедры інфекцыйных хвароб БДМУ, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, галоўны пазаштатны спецыяліст па інфекцыйных захворваннях Міністэрства аховы здароўя Ігар КАРПАЎ**, ранні пачатак сезоннага ўздыму грыпу ў ЗША ссунуўся на тры тыдні. Ускосна гэта сведчыць пра тое, што і ў нас можа быць змена дамінуючага рэспіраторнага віруса. І мы таксама не пазбегнем сур'ёзнага ўздыму захваральнасці на грып.

Інфекцыяніст таксама адзначыў, што пандэмія COVID-19 яшчэ не скончылася. Мы хоць і не ў эпіцэнтры, але і заканчэння яе яшчэ не відаць. Адзначаецца павелічэнне рэспіраторна-сінцытыяльных вірусаў, асабліва ў пажылых людзей і дзяцей да двух гадоў.

У групе рызыкі тыя ж пацыенты, што і раней, — пажылыя, с сур'ёзнымі хранічнымі хваробамі, імунадэпрэсіяй. Таму як ніколі сёлета актуальная вакцынацыя супраць грыпу. Не трэба забываць і пра прышчэпкі супраць каранавіруса. Нагадаць пра парадак вакцынацыі мы папрасілі **загадчыка аддзялення імунапрафілактыкі Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Марыну КАЧКАН**.

***— Марына Віктараўна, цяпер кажуць аб віруснай трыдэміі, якая набірае абароты ў ЗША. Адным са сродкаў яе прафілактыкі называюць вакцынацыю. Наколькі актыўна сёлета праводзіцца кампанія вакцынацыі супраць грыпу?***

— Кампанія вакцынацыі ў бягучым годзе прайшла вельмі актыўна і ўжо амаль завяршылася. Ужо прышчэплена не менш як 40 працэнтаў насельніцтва.

***— Калі чакаецца хваля грыпу і ці ёсць ужо яго выпадкі?***

— У лабараторна абследаваных захварэлых жыхароў Мінскай вобласці часцей за ўсё вызначаюцца рэспіраторна-сінцытыяльныя вірусы і рынавірусы. Вірус грыпу выдзелены толькі ў адной пробе. Уздым захваральнасці на грып часцей за ўсё ў нашай краіне бывае ў лютым.

***— Як праходзіць вакцынацыя супраць COVID-19? Якая вакцына ад каранавіруснай інфекцыі маецца?***

— Кампанія вакцынацыі супраць COVID-19 працягваецца. Асноўны ўпор сёння — на правядзенне бустарнай (паўторнай) прышчэпкі дарослым і вакцынацыю дзяцей 5–17 гадоў. У арганізацыях аховы здароўя маюцца ў дастатковай колькасці вакцыны: расійская «Гам-КОВІД-Вак» (II кампанент), кітайская кампаніі SINOPHARM Vero Cell і ўпершыню нядаўна паступіла



кубінская «Саберана Плюс». Першыя дзве вакцыны могуць прымяняцца ў першаснай і бустарнай вакцынацыі, кубінская прызначана толькі для бустарнай вакцынацыі (аднаразова). Сур'ёзныя пабочныя рэакцыі на дадзеныя вакцыны не зарэгістраваны. Кубінская вакцына — субадзіночная, чакаем, што выпадкі пабочных рэакцый лёгкай і сярэдняй ступені на ўвядзенне гэтай вакцыны будуць толькі адзінкавыя.

***— Ці можна запрасіць прышчэпачную брыгаду ў працоўны калектыў? Ці могуць прышчапіць ад грыпу і каранавіруса адначасова?***

— Магчымае адначасовае правядзенне прышчэпак супраць грыпу і каранавіруснай інфекцыі ў розныя ўчасткі цела. Гэта для чалавека зручна, бо змяншае колькасць наведванняў арганізацыі аховы здароўя. Таксама можна запрасіць прышчэпачную брыгаду ў працоўны калектыў, што выключае неабходнасць наведвання паліклінікі.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Макрон: закон ЗША аб зніжэнні інфляцыі «звышагрэсіўны»

Французскі лідар Эмануэль Макрон 30 лістапада ў Бібліятэцы Кангрэса звярнуўся да амерыканскіх заканадаўцаў ад абедзвюх палітычных партый і выступіў супраць новых субсідый ЗША, якія раздражняюць еўрапейскіх лідараў. Аб гэтым паведамляе Reuters са спасылкай на інфармацыю ўдзельніка сустрэчы за зачыненымі дзвярамі.

Макрон заявіў, што закон аб зніжэнні інфляцыі быў «звышагрэсіўны» адносна еўрапейскіх кампаній.

Закон аб зніжэнні інфляцыі, падпісаны амерыканскім лідарам Джо Байдэнам у жніўні, прапануе вялікія субсідыі для тавараў, выробленых у ЗША. На думку еўрапейцаў, ён ставіць у нявыгаднае становішча неамерыканскія кампаніі і нанясе сур'ёзны ўдар па эканоміцы Еўропы.

Прэзідэнт Францыі прыбыў у Вашынгтон 29 снежня са сваім другім дзяржаўным візітам у Злучаныя Штаты з моманту ўступлення на пасаду ў 2017 годзе. Макрон стаў першым замежным лідарам, якому арганізавалі дзяржаўную вячэру ў Белым доме, што сведчыць аб яго важнасці для Вашынгтона, нягледзячы на некаторыя рознагалоссі з цяперашняй амерыканскай адміністрацыяй.

Раней Макрон разам з віцэ-прэзідэнтам ЗША Камалай Харыс наведаў штаб-кватэру НАСА і сказаў, што амерыкана-французскае супрацоўніцтва важна для процідзеяння рызыцы канфлікту ў космасе.

## Кіраўнік МЗС Расіі Лаўроў заявіў, што аднаўленне ранейшых адносін з Захадам не будзе

Міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў заявіў, што аднаўленне ранейшых адносін РФ і заходніх краін у галіне работы па еўрапейскай бяспецы не прадбачыцца, калі ўлічваць сённяшнія дзеянні Захаду, а таксама АБСЕ паасобку. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны».

«Калі ў нейкі момант часу нашыя заходнія суседзі, а ад суседства нікуды не падзецца, і былыя партнёры раптам зацікавяцца тым, каб неяк аднавіць сумесную работу па еўрапейскай бяспецы, то аднаўлення не атрымаецца. Аднаўленне азначае тое, што было раней. Але так ужо не будзе», — сказаў ён.

Паводле слоў міністра, дзеянні АБСЕ і заходніх дзяржаў зараз ставяць няпростыя пытанні наконт таго, якімі будуць адносіны Расійскай Федэрацыі і арганізацыі, а таксама аб тым, што будзе з самой АБСЕ.

«Калі Захад зразумее, што лепш суседнічаць на аснове нейкіх узаемаўзгодненых асноў, мы паслухаем, што ён прапануе, гэта павінны быць прынцыпова новыя пачаткі ўзаемадзеяння», — падкрэсліў Лаўроў.

Міністр заявіў, што Паўночнаатлантычны альянс вярнуўся да прыярытэтаў халоднай вайны. Паводле яго слоў, Расію хочуць трымаць па-за Еўропай, а амерыканцаў — у Еўропе.

## Улады Швейцарыі заблакіравалі расійскія актывы на суму $8 млрд



Міністэрства эканомікі Швейцарыі паведаміла аб замарозцы расійскіх фінансавых актываў на суму каля $8 млрд, паведамляе прэс-служба ведамства.

Па стане на 25 лістапада 2022 года, замарожаныя актывы расійскіх фізічных і юрыдычных асоб у Швейцарыі склалі 7,5 млрд франкаў ($7,94 млрд), сказана ў дакуменце. У заяве адзначаецца, што таксама заблакіраваныя 15 аб'ектаў нерухомасці ў шасці кантонах Швейцарыі.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | Минское областное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by |

**Предмет повторного электронного аукциона**

**Магазин** (общ. пл. 63,7 кв. м, инв. № 602/С-50877).
**Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, Туринский с/с, д. Подбережье, 1В**
Сведения о земельном участке: пл. 0,0240 га, предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 25.08.2043) для обслуживания магазина

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 8 661,37 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы». Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **7 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 04.01.2023 с 13.00 до 14.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 03.01.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(организатор аукциона, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 017 516-80-61)*
**по поручению
Смолевичского районного исполнительного комитета**
*(продавец, место нахождения: г. Смолевичи, ул. Советская, 125, тел. 801776 27-633),*
**проводит открытый аукцион по продаже**
**ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ**
**с инв. № 614/D-15581 (наименование –
помещение спортивного назначения № 2)
общей площадью 187,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Смолевичи, ул. Советская, 134, сведения о земельном участке: кадастровый номер 624850100003000840, площадь 0,2860 га (право аренды до 05.06.2061, доля в праве 7/50).**

Начальная цена без НДС **– 145 625,24 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **14 562,00** бел. руб.
Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 16.09.2022, 02.11.2022.
**Информация о торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by, rlt.by.**

Аукцион состоится **22.12.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.12.2022** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.
Тел. для осмотра 8 (01776) 287 81.** УНП 600014139

На работу в г. п. Руденск ТРЕБУЮТСЯ
✓ УПАКОВЩИЦА ✓ УБОРЩИЦА
8 029 611 11 27
ЧП «Шалу» УНП 800005774

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**Организатор: Государственное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска»,**
*220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, +375173649127*

Торги проводятся **28.12.2022 г.** ЭТП «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**

***Л/АВТОМОБИЛЬ SAMAND, 2010 г., черный – 3037,50 BYN***

Окончание приема заявлений – 23.12.2022 до 15.00.
Подробная информация на сайте **www.et.butb.by.** УНП 192605364

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов: «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ № 1833117 – 1 шт. УНП 100782388

Моцныя духам

# «Такія ж, як і вы»

## Пераможца Міжнароднага фестывалю творчасці інвалідаў «Віцебск-2022» Глеб ВАРАНЦОЎ — пра веру і работу над сабой

**«Я не баюся адзіноты, мне заўсёды ёсць чым заняцца», — з гэтых слоў пачалося маё знаёмства з чалавекам вялікай сілы Глебам. Прыгожы, з ветлівай усмешкай і адметным гумарам, — такі, як і ўсе, але са сваёй асаблівай жыццёвай гісторыяй, якая не зламала, а наадварот, прымусіла паглядзець на навакольле з іншага ракурсу.**



Ён нарадзіўся ў Віцебску, з самага дзяцінства марыў стаць музыкантам. Пасля школы паступіў у Віцебскі дзяржаўны музычны каледж імя І. Салярцінскага па спецыяльнасці «Харавое дырыжыраванне (акадэмічны хор)». Здавалася б, да рэалізацыі мары рукой падаць, але лёс унёс у жыццёвыя планы свае жорсткія карэктывы. Яшчэ на другім курсе Глеб пачаў заўважаць за сабой, што на занятках стаў няўважлівым і млявым. Маці з бабуляй параілі схадзіць да ўрача і праверыць шчытавіцу. У бальніцы паставілі дыягназ: гіпатырыёз, назначылі лячэнне, але было занадта позна — праблема са шчытападобнай залозай стварыла ўмовы для развіцця іншай хваробы. Тады ўрач сказаў словы, якія навечна ўрэзаліся ў памяць мужчыны: «Цябе чакае пажыццёвая рэабілітацыя»...

Аб ёй Глеб расказваць не хоча: хвароба перакрэсліла чаканую кар'еру. У 2011-м Варанцову афармілі групу інваліднасці, але ён, нягледзячы на круты паварот, усё роўна знайшоў сваё прызнанне. Мужчыну запрасілі ў царкоўны хор Успенскага храма. У якасці выключэння Глеб паступіў у жаночае духоўнае вучылішча на завочнае аддзяленне. Сёння ён працуе намеснікам кіраўніка хору, што прыносіць дадатковы заробак да пенсіі.

«З тога моманту маё жыццё змянілася. Новая абстаноўка і калектыў — было цяжка, але дзякуючы той рабоце пачалася рэабілітацыя. У многім дапамагла мая музычная адукацыя, цяпер у вольны час я ствараю на фартэпіяна мелодыі для сяброў і свят у цэнтры. Любая работа мне прыносіць радасць, асабліва — работа над сабой», — расказвае Глеб.

Калі справы пачалі наладжвацца, лёс паслаў мужчыну яшчэ адно выпрабаванне: у Глеба выявілі рак шчытападобнай залозы першай стадыі. Перад аперацыяй у Мінску музыкант хваляваўся толькі за адно — свой голас, бо пад шчытавіцай знаходзіцца зваротны нерв, які адказвае за работу галасавых звязак. «Калі б хірург зачапіў яго падчас аперацыі, я застаўся б без работы. Але, на шчасце, усё прайшло добра, пасля наркозу доктар пашлёпаў мяне па шчэках: «Глеб, прачынайся», а я звыкла адказаў: «Ага!», сам нечакана ўзрадаваўся, што голас застаўся такім, як і да аперацыі», — успамінае Варанцоў.

Музыкант расказвае, што барацьба з хваробай даецца яму нялёгка, хоць зараз знаходзіцца ў стадыі рэмісіі, групу змянілі з другой на трэцюю. Спраўляцца з цяжкасцямі яму дапамагаюць самадысцыпліна і словы свайго настаўніка, якія сталі жыццёвым крэда Глеба: «Інвалід — гэта не той чалавек, у якога праблемы са здароўем, а той, хто нічога не робіць». Ён знайшоў крыніцу энергіі ў музыцы: на фартэпіяна піша мелодыі, адна з іх называецца «Адзінокія мары», у якой праз ноты Глеб расказвае гісторыю барацьбы душы з хваробай.

Ён не наракае на сваю долю — проста дзень за днём працуе над сабой. Дзяржава аказвае матэрыяльную падтрымку, пры жаданні можна знайсці работу, але, расказвае Глеб, яшчэ не ва ўсіх арганізацыях вырашана праблема прыняцця на работу людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Эмацыянальная аддушына — музыка — стала для яго інструментам уздзеяння на людзей, спосабам данесці да астатніх думку, што, нягледзячы на розныя фізічныя магчымасці, усе мы — роўныя. У ліпені ў Віцебску прайшоў Міжнародны фестываль творчасці інвалідаў імя Ігара Лучанка, на якім Глеб Уладзіміравіч заняў першае месца з песняй «Мы проста іншыя».

«У ёй закладзены вялікі сэнс: барацьба людзей з абмежаванымі магчымасцямі за сваё месца пад сонцам. На жаль, і дагэтуль наша грамадства не адышло ад савецкага ярлыка «інвалід», стыгматызацыя дзе-нідзе праяўляецца. Мы адрозніваемся ад іншых, але хочам быць як усе», — расказвае артыст.

Гэта не першая перамога ў яго творчасці. З 2014 года Глеб пачаў наведваць Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна і штогод прымаў удзел у міжнародным фестывалі. У 2016 годзе ён прапанаваў на конкурсе песню ўласнага сачынення «Дарога ў жыццё» на фартэпіяна, яскравае выступленне прынесла музыканту «залата» фестывалю. Акрамя гэтага конкурсу Глеб Уладзіміравіч не ўдзельнічае ў іншых, лічыць, што ўзнагароды і лаўры — не галоўнае ў жыцці, а ў ТЦСАН з ахвотай прымае ўдзел у падрыхтоўцы да свят: піша музыку, арганізоўвае віктарыны. Галоўным жыццёвым маяком, які падтрымлівае ў ім сілы і не дае скласці рукі, для музыканта з'яўляюцца Бог і вера, без якой душа чалавека высыхае.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота газеты «Разам!»**

Надвор'е

# ЗІМА ЗАЯЎЛЯЕ АБ САБЕ «СУР'ЁЗНЫМІ» ТЭМПЕРАТУРАМІ

## У першыя дні снежня мінус 16 градусаў — ужо занадта

**Холадна. Але гэта як паглядзець, бо на наступным тыдні днём будзе да плюс 2 градусаў. А значыць, галалёд і хлюпота. Пакуль жа зіма ў нашай краіне вырашыла ўмацаваць свае пазіцыі. Пачаўшы са снегу, яна працягвае сваё наступленне маразамі. Халодная паветраная маса, якая распаўсюджваецца з усходу, адчувальна панізіла тэмпературу паветра. Ужо ночу на чацвер тэмпература паветра па краіне ў асноўным склала мінус 5—12 градусаў. Па ўсходзе краіны маразы падужэлі да мінус 13—14 градусаў, а вось у заходніх раёнах краіны падмарозіла да мінус 1—4 градусаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Марознае надвор'е захаваецца ў пятніцу і суботу. Яго ўмовы галоўным чынам прадоўжыць вызначаць Паўднёва-Заходняя перыферыя антыцыклону з цэнтрам над Расіяй, аднак з тэрыторыі Украіны пачне распаўсюджвацца вільготная няўстойлівая паветраная маса. Ноччу па паўднёвым захадзе, а раніцай і днём месцамі па краіне пройдзе невялікі кароткачасовы снег, у паўднёва-заходніх раёнах мокры. Будзе слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 3—10 градусаў, пры праясненнях мінус 15 градусаў. Удзень чакаецца ад нуля да мінус 7 градусаў.

У нядзелю ў многіх раёнах краіны пройдзе невялікі снег. Па паўднёвым захадзе будзе мокры снег і слабы галалёд. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Начная тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 2 да мінус 9 градусаў, па паўночным усходзе пры праясненнях да мінус 13 градусаў. Днём прагназуецца мінус 6 — плюс 1 градус.

У панядзелак чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па поўначы і захадзе краіны магчымы кароткачасовы мокры снег і слабы галалёд. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу будзе мінус 4—11, па ўсходзе пры праясненнях мінус 16 градусаў. Удзень чакаецца мінус 4—9 градусаў. У крайніх заходніх раёнах краіны ўначы і днём тэмпература паветра складзе мінус 3 — плюс 1 градус.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# НЕ ВЫСЛУХАЛІ. ЗВОЛЬНІЛІ. АДНАВІЛІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Высветлілася, што работніца не з'яўляецца членам прафсаюза на сваім прадпрыемстве, хоць «пярвічка» там існуе. Прытым сітуацыя жанчыны была нестандартная. Прыватныя юрысты нават не сталі б з гэтым працаваць, а чалавек, безумоўна, аказаўся ў складанай жыццёвай сітуацыі, — дадае Таццяна Сташук.

Жанчына звярнулася да галоўнага прававога інспектара ў адчаі. Стала зразумела, што толькі тэлефоннай кансультацыі недастаткова. Заяўніцы прапанавалі падаць пісьмовую заяву ў абласное аб'яднанне прафсаюзаў.

— Наймальнік не сустрэўся з работнікам, не азнаёміў яго з загадам аб звальненні і прычынай такога рашэння, не выдаў працоўную кніжку, аб звальненні жанчыне паведамілі па тэлефоне, — тлумачыць галоўны прававы інспектар працы.

Каб дасканала разабрацца ў складанай сітуацыі, спецыяліст выехала ў раён і правяла маніторынг захавання арганізацыяй, што звольніла цяжарную жанчыну, працоўнага заканадаўства.

— Быў выяўлены шэраг парушэнняў, якія ў судзе былі б выкарыстаны на карысць работніка. На гэтыя заўвагі мы звярнулі ўвагу наймальніка і юрыста арганізацыі. Парэкамендавалі працягнуць працоўныя адносіны з работнікам — аднавіць яе на рабоце, каб цяжарная жанчына спакойна пайшла ў належны ёй водпуск па доглядзе дзіцяці. Пасля накіравалі пісьмовую рэкамендацыю аб тым, што неабходна выправіць сітуацыю з работніцай у законным парадку, — расказвае Таццяна Сташук.

Ніякіх дзеянняў у адказ ад наймальніка не паступіла. Галоўны прававы інспектар працы Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў склала іскавую заяву аб аднаўленні супрацоўніка на рабоце, а таксама аб спагнанні з наймальніка сярэдняга заробку за час вымушанага прагулу і кампенсацыі маральнай шкоды. У судзе звольненая жанчына сама прадстаўляла свае правы, бо з-за адсутнасці статусу члена прафсаюза не мела права на прадстаўленне яе інтарэсаў з боку прававога інспектара абласнога аб'яднання. Пры гэтым заяўніца пасля кожнага пасяджэння магла звяртацца па кансультацыю да спецыяліста. Судовая цяжба скончылася тым, што іск аб аднаўленні на рабоце суд цалкам задаволіў.

— Жанчыну аднавілі на рабочым месцы, выплацілі заробак за час вымушанага прагулу ў памеры 476 рублёў і кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 200 рублёў. Акрамя таго, наймальнік аплаціў звольненай водпуск па цяжарнасці і родах, які першапачаткова аплачваць адмаўляўся, — падкрэслівае Таццяна Сташук.

Варта адзначыць, што і рашэнне суда кіраўніцтва арганізацыі выконваць не спяшалася. Пацвердзіла спецыяліст і тое, што падчас адстойвання сваіх правоў работніца падвяргалася эмацыянальнаму і псіхалагічнаму ціску з боку наймальніка.

**АСОБА: БУДУЧАЯ МАМА**

Дваццацісямігадовы кухар Маргарыта са Жлобіна літаральна з дня на дзень рыхтуецца першы раз стаць маці. Толькі крыху больш чым месяц таму жанчына нарэшце паставіла кропку ў гісторыі свайго звальнення з работы.

— Працавала кухарам у адной з аграсядзіб раёна. Спачатку каля года проста па дагаворы падраду, а ўжо сёлетняй вясной са мной заключылі кантракт. У красавіку зацяжарала. Гэта была вельмі радасная навіна, бо мы з мужам каля пяці гадоў марылі аб дзіцяці. На рабоце я спачатку не хацела нікому казаць, што планую пайсці ў дэкрэтны водпуск. Калі стала на медыцынскі ўлік па цяжарнасці, прынесла адпаведную даведку, — расказвае Маргарыта.

Прызнаецца, цяжарнасць працякала неспакойна — прыходзілася раз за разам ісці на бюлетэнь, класціся ў стацыянар. На рабоце пачаліся праблемы. Прывядзём цалкам апісанне падзей апошніх месяцаў з першых вуснаў суразмоўцы:

— У жніўні я выйшла на змену як заўсёды. Усіх сабралі на планёрку, і дырэктар паказаў запісы з камер відэаназірання, на якіх я кладу штосьці з прадуктаў у пакет і выходжу. Мне не далі і слова сказаць у апраўданне, адправілі пісаць заяву на звальненне па дамове бакоў. Я сабрала рэчы і паехала ў паліклініку, бо блага сябе адчувала. У гэты дзень мяне паклалі на захоўванне цяжарнасці ў радзільню. На работу, зразумела, я ўжо не выйшла. На наступны дзень высветлілася, што павінна была выходзіць на работу ў начную змену з васьмі гадзін вечара да васьмі раніцы, пры гэтым вядома, што я цяжарная і што мне нельга працаваць па такім графіку. Праз пэўны час да мяне ў бальніцу прыйшоў участковы і распавёў, што мой дырэктар плануе падаваць на мяне заяву ў міліцыю за крадзеж. Я адказала, што няхай падае і даказвае, калі я штосьці скрала. Справа па гэтым абвінавачванні ўсё ж такі да суда дайшла, але на пасяджэнне мой дырэктар не з'явіўся і ніякіх доказаў маёй віны не даў.

Жанчына ўпэўненая, што звольнілі яе па надуманых падставах. Таму і вырашыла даказаць, што наймальнік парушыў закон. Падаваць заяву ў суд, прадстаўляць там свае правы ёй і сапраўды прыйшлося ў перапынках паміж шпіталізацыямі.

— Муж адгаварваў нешта даказваць. Але мне стала вельмі крыўдна. Мяне абвінавацілі ў крадзяжы, каб звольніць. Пры гэтым я, пакуль не зацяжарала, «жыла» на той рабоце, — дадае Маргарыта.

**ІНШЫ БОК: КАЛЕКТЫЎ І НЕГАТЫЎ**

Бачанне сітуацыі ўласна ад самога наймальніка Маргарыты, на жаль, высветліць не ўдалося. Па тэлефоне, што ўказаны як адзіны для любых зваротаў у адрас арганізацыі, адказала дзяжурны супрацоўнік Ірына. Яна паведаміла, што на яе вачах разгортвалася сітуацыя, у якой апынулася калега. Калектыў, па словах Ірыны, адназгалосна падтрымаў рашэнне кіраўніка аб звальненні Маргарыты:

— Гэтага чалавека як быццам падмянілі. Была вельмі добрая дзяўчына, выдатна працавала, нічога не магу сказаць. Пасля дэманстрацыі ёй відэа з камер назірання, дзе відаць, як яна выносіць пакет з булачкамі (у нас правяраюць сумкі, калі супрацоўнікі выходзяць з работы), Рыта даводзіла, што прыносіла прадукты з дому, каб тыя булкі спячы. Але ў нас так не заведзена...

Тым не менш цяжарная жанчына была звольнена са шматлікімі парушэннямі прававога заканадаўства з боку наймальніка. А прэзумпцыю невінаватасці ніхто не адмяняў.

**ДА ВЕДАМА: У ДАСУДОВЫМ ПАРАДКУ**

Па інфармацыі галоўнага прававога інспектара працы Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Таццяны Сташук, у рэгіёне ў мінулым годзе 13 работнікаў былі аднаўлены на пасадах. Іх парушаныя законныя правы абаранілі юрысты праз суд. Сёлета ў першым паўгоддзі аднаўлены на рабоце трое жыхароў рэгіёна.

— Дарэчы, у гэтым годзе больш наймальнікаў стала прыслухоўвацца да рэкамендацый па выпраўленні парушэнняў працоўнага права. Наймальнікі імкнуцца ўсё часцей вырашаць спрэчныя сітуацыі ў дасудовым парадку. Гэта могуць быць не толькі адмены незаконнага рашэння аб звальненні, але і вяртанне грошай пасля іх незаконнага спагнання, — адзначае інспектар.

На жаль, жаданне будаваць канструктыўны дыялог паміж наймальнікам і працаўніком, унікнуць у сітуацыю з розных бакоў, пачуць апанента сустракаецца не заўсёды. Тады і нараджаюцца гісторыі, як са звольненым кухарам са Жлобіна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Кінасеанс

# СЕМ НЯНЕК І САПРАЎДНАЕ КАХАННЕ

**На наступным тыдні тэлеканал «Беларусь 3» прапануе шэраг цікавых фільмаў і перадач. У іх ліку і кіно, праверанае часам, — камедыі «Сем нянек», «Нечаканая-негадана».**

Камедыю «Сем нянек» Ралана Быкава, знятую ў 1962 годзе, пакажуць у панядзелак. Лічыцца, што гэта яго другая работа ў якасці рэжысёра (першая спроба — кінаспектакль «Прачынаецца раніца» 1959 года). А кінастужка пасля свайго з'яўлення на экране была добра прынятая гледачамі, але пасля знікла на 15 гадоў. Ёсць меркаванне, што прычынай таму стаў быццам бы паказ у «нявыгадным святле» брыгады гадзіннікавага завода. Бо на фоне актыўна дзеючых маладзёжных



будоўляў і агітацыі па далучэнні туды моладзі дэманстрацыя фільма была не самай лепшай ідэяй. Аднак, вярнуўшыся на экраны ў 1980-х, кінаработа вярнула сваю аўдыторыю, таму што тэма выхавання падрастаючага пакалення — класіка. Адпаведна сюжэту, маем простую, добрую гісторыю пра тое, як чалавек можа мяняцца, калі яму дапамагчы, а таксама пра шчасце людзей, якім удаецца здзяйсняць задуманае.

А ў сераду можна пераглядзець камедыйную меладраму «Нечаканая-негадана» рэжысёра Генадзя Мелканяна (1982). Кінагісторыя пра тое, як могуць нечаканае багацце і новыя знаёмствы змяніць чалавека і ход яго жыцця ды дапамагчы ўсвядоміць, што па-сапраўднаму каштоўнае. Не прапусціце паказ фільма 7 снежня на тэлеканале «Беларусь 3».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 160

Сваю новую задачу даслаў наш чытач Міхаіл Кошаль з Мінска *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Кре1, Фd8, Лf8, Cb4, Cc4 (5).

**Чорныя:** Кре4, пf5 (2).

Мат за 2 хады.

